# § 29. Культура Беларусі ў другой палове XIII — XV ст.

ГАТЫЧНЫ СТЫЛЬ
РАТУШЫ МІНІЯЦЮРА
ПАНЕГІРЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА
ЗАМАК-КАСТЭЛЬ ВІТРАЖЫ
РАМАНСКІ СТЫЛЬ
ІКАНАПІС ФРЭСКІ

Уплыў заходнееўрапейскай культуры

**1. Культурныя працэсы ў ВКЛ у другой палове XIII — XV ст.** У другой палове XIII — XV ст. у развіцці культуры Беларусі адбыліся значныя змены. Назіраліся паступовы пераход ад візантыйскіх да заходнееўрапейскіх узораў архітэктуры, выяўленчага мастацтва і літаратуры, пранікненне раманскага і гатычнага стыляў. І калі першы не атрымаў у гэты перыяд на тэрыторыі Беларусі вялікага пашырэння (яго асобныя рысы праяўляліся толькі ў адзінкавых помніках архітэктуры і скульптуры), дык гатычны стыль значна болей паўплываў на развіццё беларускага мастацтва. Ён стаў пануючым у скульптуры, жывапісе, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

З чым быў звязаны пераход у другой палове XIII — XV ст. да заходнееўрапейскіх узораў культуры?

Для культуры гэтага перыяду характэрны ваяўнічы дух і ўвасабленне пастаяннай неабходнасці бараніцца. У архітэктуры гэта праяўляецца ў будаўніцтве замкаў-крэпасцей і храмаў-крэпасцей.

Сярэдневяковыя замкі

**2. Культавае і абарончае дойлідства.** У другой палове XIII ст. пачаўся новы этап у развіцці дойлідства на тэрыторыі Беларусі. Візантыйска-праваслаўная культурная спадчына, традыцыі полацкай і гарадзенскай архітэктурных школ

Успомніце характэрныя рысы архітэктурных школ у Полацку і Гародні.

дапаўняліся элементамі заходнееўрапейскіх стыляў, што дадавала ўнікальнасці беларускаму дойлідству. На аснове сінтэзу розных архітэктурных формаў беларускія майстры стварылі самабытныя і непаўторныя збудаванні.

Няспынныя войны і ўдасканаленне баявой тэхнікі вымушалі мяняць сістэму ўмацавання паселішчаў і гарадоў. Новым тыпам абарончага дойлідства ў эпоху Сярэднявечча зрабіўся замак, якому былі ўласцівыя прастата і суровасць. Некаторыя замкі маглі складацца з дзвюх частак — Ніжняга і яшчэ больш магутнага Верхняга замка (Полацк, Віцебск).

### Замкі тыпу «кастэль»

У XIV ст. пачалося будаўніцтва каменных замкаў, якія сваёй кампазіцыяй набліжаліся да заходнееўрапейскіх рыцарскіх замкаў тыпу «кастэль». Цэлы пояс такіх збудаванняў паўстаў уздоўж паўночна-заходняй мяжы Вялікага Княства Літоўскага, утварыўшы абарончую сістэму агульнадзяржаўнага значэння.

Аснову для развіцця замкавай і палацава-замкавай архітэктуры наступных стагоддзяў заклалі замкі ў Лідзе і Крэве. Рэканструяваны замак у Лідзе дае

## СЯРЭДНЕВЯКОВЫ ЗАМАК



- Меў форму прамавугольніка або трапецы
- Меў тоўстыя і высокія муры, магутныя вежы з байніцамі
- Размяшчаўся ў маладасяжнай для непрыяцеля мясцовасці
- На тэрыторыі замка знаходзіліся жылыя, гаспадарчыя, абарончыя і культавыя збудаванні
- На тэрыторыі замка меліся калодзеж і месца для размяшчэння запасаў зброі і ежы

Якія функцыі выконваў сярэдневяковы замак?

візуальнае ўяўленне пра знешнія характарыстыкі гэтых пабудоў. Яго замкавыя муры цалкам складзеныя з валуноў, змацаваных вапнай, і толькі верхнія часткі і заканчэнні сцен — з буйной цэглы. Замак пабудаваны ў строгіх і лаканічных архітэктурных формах. У яго фрагментах, якія захаваліся, яскрава выяўляюцца фрагменты раманскай архітэктуры. Лідскі замак узведзены ў 20-я гг. XIV ст. па загадзе вялікага князя літоўскага Гедыміна.

Больш значныя памеры меў замак у Крэве, пабудаваны ў 30-я гг. XIV ст. У Крэўскім замку вялікая вежа (вежа Кейстута) вынесена за перыметр сцяны, што ў тыя часы павялічвала яго абараназдольнасць.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Лідскі замак — адзін з першых на тэрыторыі Беларусі замкаў-кастэляў. Замак у Крэве ўяўляе сабой часткова адноўленыя руіны некалі магутнага фартыфікацыйнага комплексу.

1. *Вызначце, з якіх элементаў складаўся замак-кастэль. Што сведчыць пра тое, што замкі мелі важнае значэнне як абарончыя збудаванні?*
2. *Якія важныя гістарычныя падзеі звязаны з прадстаўленымі на выявах замкамі?*
3. *Складзіце рэкламную ўлётку (флаер), якая будзе запрашаць турыстаў наведаць замкі-кастэлі ў Беларусі.*



*Замак у Крэве. Рэканструкцыя*



*Замак у Лідзе. Рэканструкцыя*

## Замкавае будаўніцтва

У сярэдзіне XIV ст. узведзены Віцебскі замак, на які ўскладалася важная стратэгічная роля ва ўсходняй палітыцы ВКЛ. Каменныя сцены пабудаваны па перыметры старога дзяцінца і прылеглага горада, у выніку яны ўтварылі адзіную абарончую сістэму, якая складаецца з Верхняга і Ніжняга замкаў. Аднак тыя ўмацаванні праіснавалі нядоўга.

Як вы лічыце, чаму абарончае дойлідства робіцца пануючым менавіта ў XIV–XV стст.?

Актыўнае абарончае дойлідства вялося ў Гародні. У канцы XIV — XV ст. сістэму абарончых збудаванняў горада склалі два замкі: Верхні (Стары) і Ніжні (Новы). Абодва замкі мелі магутныя каменныя сцены і злучаліся паміж сабой мостам, перакінутым цераз роў. У гэты час адбываецца і ўмацаванне Новагародскага замка, дзе былі дабудаваныя Дазорная вежа і Мінская брама. Сямівежавы замак зрабіўся магутным абарончым збудаваннем на тэрыторыі Беларусі ў эпоху Сярэднявечча.

## Культавае дойлідства

Няспынная ваенная пагроза наклала адбітак і на культавае будаўніцтва. У XIV–XV стст. замацоўваецца гатычны стыль. Да нашых дзён захаваліся касцёлы, пабудаваныя ў гэтым стылі, у вёсках Уселюб (Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці), Ішкальдзь (Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці) і інш.

На мяжы XV–XVI стст. на тэрыторыі Беларусі пашырыўся спецыфічны тып царквы, у якім паяднoўваліся рысы готыкі, традыцыйнага візантыйска-рускага стылю і элементы абарончага характару. Так паўстаў унікальны тып праваслаўнага храма, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай *праваслаўная готыка*.

### РЫСЫ ПРАВАСЛАЎНАЙ ГОТЫКІ

- Стрыманасць і суровасць
- Цэгла ў якасці будаўнічага матэрыялу
- Трохвугольны востраканечны фасад
- Скругленыя аркі і нішы
- Кантрфорсы — падпоркі для сцен

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*1. Назавіце асноўныя элементы беларускага храмавага дойлідства, якія сведчаць пра абарончую функцыю збудаванняў.*
*2. Параўнайце храмы гатычнага стылю Заходняй Еўропы і праваслаўнай готыкі: матэрыял, фасад, аркі і нішы. Зрабіце вывад наконт асаблівасцей дадзенага стылю на тэрыторыі Беларусі.*
*3. Якія адметныя рысы праваслаўнай готыкі вы можаце назваць у прадстаўленых помніках архітэктуры Беларусі?*



*Царква Нараджэння Багародзіцы. В. Мураванка. Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці*



*Царква Святога Міхаіла. В. Сынкавічы. Зэльвенскі раён Гродзенскай вобласці*



*Касцёл Святой Тройцы. В. Ішкальдзь. Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці*

**3. Літаратура.** Развіццю беларускай літаратуры ў XIV–XV стст. спрыяла тое, што старабеларуская мова мела ў Вялікім Княстве Літоўскім статус дзяржаўнай. Аснову літаратуры складалі, як і раней, творы рэлігійнага характару — кнігі для набажэнстваў, Біблія, у тым ліку евангеллі, а таксама жыціі, павучанні і інш. У гэты час з'явіліся першыя пераклады рэлігійнай літаратуры на старабеларускую мову.

**Творы рэлігійнага характару**

У XIV–XV стст. узніклі і іншыя творы. Напрыклад, творы *паломніцкай літаратуры*, якія нечым нагадвалі падарожныя нататкі, складзеныя падчас паломніцтва ў Іерусалім. У XV ст. з'явіўся жанр *панегірычнай літаратуры*, якая праслаўляла пэўных асоб. Найбольш вядомым творам з'яўляецца «Пахвала Вітаўту», створаная ў першай палове XV ст.

**Новыя жанры**

у Смаленску. У ёй праслаўляецца Вітаўт як мудры і магутны валадар, які карыстаецца міжнародным аўтарытэтам. Вялікае Княства Літоўскае паказваецца як адзіная дзяржава балтаў і славян, адзін з галоўных цэнтраў «збірання рускіх земель».

**Летапісы**

Успомніце, што такое летапіс. Чаму гэты жанр літаратурных твораў з'яўляецца найбольш каштоўным для гісторыкаў?

У XV ст. былі створаны выдатныя летапісныя творы, адметнай рысай якіх з'яўляецца агульнадзяржаўны характар. Адсюль і назва — «беларуска-літоўскія» летапісы. Яны напісаныя на старабеларускай мове і раскрываюць найважнейшыя падзеі ў Вялікім Княстве Літоўскім, адлюстроўваюць змены ва ўнутранай і знешняй палітыцы, паходжанне пануючага саслоўя шляхты і князёў.



*Гульня ў косці. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу. XV ст.*

Радзівілаўскі летапіс — летапісны помнік, які захаваўся ў двух спісах XV ст. Ён пачынаецца «Аповесцю мінулых гадоў» і даводзіць выклад падзей да пачатку XIII ст. Назва летапісу паходзіць ад імя віленскага ваяводы Я. Радзівіла, які валодаў першым спісам у XVII ст. Унікальнасць рукапіснай кнігі заключаецца ў яе мініяцюрах (больш за 600), змешчаных амаль на кожнай старонцы. Гэтыя ілюстрацыі з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння гістарычных падзей перыяду Старажытнай Русі.

**4. Забавы і святы.** Жыццё простага чалавека ў тыя часы цалкам залежала ад працягласці светлавога дня. З узыходам сонца ўсе падымаліся, а з захадам — кладліся спаць. Для асвятлення ў цёмны час сутак выкарыстоўвалі лучыну ці факелы з сальных або васковых свечак. Узімку ў дамах было вельмі холадна, таму людзі часта спалі апранутыя. Найважнейшымі элементамі жытла былі печ, якая служыла крыніцай цяпла, і покуць з іконай, што сімвалізавала духоўны цэнтр дома.

Нашы продкі шмат працавалі, але знаходзілі час і для забаў. Баўленне часу сялян і бедных мяшчан было звязана з народным календаром. Людзі памяталі мноства парад і забарон продкаў, перадавалі іх з пакалення ў пакаленне. Яны ведалі, калі можна

распачынаць тую ці іншую работу, а калі, наадварот, варта адкласці яе, калі можна павесяліцца, а калі лепей устрымацца ад забаў.

Каляды

У XIV–XV стст. найважнейшымі робяцца царкоўныя святы. І каталікі, і праваслаўныя ў ВКЛ аж да 1582 г. карысталіся юліянскім календаром. Праводзіны адыходзячага года і сустрэча новага былі звязаны са святам Калядаў. Урачыстае зімовае святкаванне, якое цягнулася два тыдні, надыходзіла ў ноч на 25 снежня. Каталікі называлі Калядамі не толькі «святыя вечары» або «святыя дні», але і прадукты, якімі адорвалі падчас калядавання, а таксама самі песні-калядкі. Для праваслаўных урачыстае зімняе святкаванне пачыналася з Вялікай куцці, калі абавязкова збіралася ўся сям'я. Вечарам напярэдадні Новага года святкавалі Багатую куццю. Галоднай куццёй (перад Вадохрышчам) завяршалі святкаванне Калядаў і прасілі мароз не марозіць пасевы. Купкі людзей у калядных строях хадзілі вёскай ад дома да дома, спявалі велічальныя песні пад вокнамі або проста ў дамах, а напрыканцы прасілі пачастунку.



Вясеннія святы

Да пераходнага часу паміж зімой і вясной адносяць Масленіцу, якую святкавалі за тыдзень да сямітыднёвага посту перад Вялікаднем. Надыход вясны быў звязаны са старажытным святам Камаедзіцай, калі заканчвалася зімовая спячка мядзведзя і ён выбіраўся з берлагу. На Камаедзіцу гатавалі і елі камы́ (гарохавую кашу).

Самым важным вясеннім святам быў Вялікдзень. У праваслаўнай традыцыі ён засланяе веліч свята Раства Хрыстова, бо духоўнае ўваскрасенне лічыцца важнейшым за зямное нараджэнне. На дзявяты дзень пасля Вялікадня наведвалі могілкі і ўспаміналі памерлых. Гэты дзень называлі Радаўніцай.

Летнія святы

На лета прыпадалі асноўныя сельскагаспадарчыя работы, таму сяляне мелі мала вольнага часу. У дзень летняга сонцастаяння (паводле старога стылю) беларусы здаўна адзначалі Купалле. Сакральнае значэнне

мелі купальскія вогнішчы, якія сімвалізавалі «ачышчэнне» і прыцягненне ўдачы. Купалле захавала шмат язычніцкіх рытуалаў і павер'яў. Напрыклад, верылі, што ў ноч на Івана Купалу зацвітае папараць-кветка як увасабленне адвечнай мары чалавека пра шчасце. У гэты ж дзень царква адзначае нараджэнне Іаана Хрысціцеля. Хрысціянская царква асуджала традыцыйнае народнае святкаванне Купалля.

У жніўні адзначалася адно са святаў хлеба — Трэці спас. У многіх рэгіёнах адзначалі Дажынкі — свята заканчэння жніва.

### Асеннія святы

У канцы верасня адзначалі Узвіжанне — свята «закрыцця» зямлі на зіму. У гэты дзень не хадзілі ў лес, бо верылі, што гадзюкі і вужакі збіраюцца ў клубкі, каб схавацца ў норах перад зімой. У кастрычніку, калі асноўныя сельскагаспадарчыя работы заканчваліся, адзначалі Пакровы. Пачыналіся сялянскія вяселлі. Каля цэркваў ладзілі кірмашы, каля касцёлаў — фэсты. Жанчыны і дзяўчаты хадзілі адна да адной у госці, раіліся, дзе ладзіць вячоркі (самі вячоркі звычайна пачыналіся ў сярэдзіне лістапада).




Дакажыце, што ў аснову народных святаў беларусаў быў пакладзены гадавы цыкл земляробчых работ.
Падрыхтуйце рэкламны буклет «Святы і абрады беларусаў».

*Развіццё культуры Беларусі ў XIV–XV стст. адбывалася ва ўмовах візантыйскага і заходнееўрапейскага памежжа, што сфарміравала адметныя рысы духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа. У паўсядзённым жыцці стваралася народная культура, якая ў далейшым паслужыла вытокам для многіх кірункаў мастацтва.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| XIV–XV стст. — у архітэктуры большасці краін Еўропы працягваў панаваць гатычны стыль | XIV–XV стст. — адбываецца фарміраванне ўнікальнай архітэктуры, якая спалучае элементы візантыйскіх і заходнееўрапейскіх узораў |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія фактары, на ваш погляд, паўплывалі на развіццё культуры ВКЛ у XIV–XV стст.?
2. Ахарактарызуйце асаблівасці архітэктурных збудаванняў на тэрыторыі Беларусі ў XIV–XV стст. У якіх помніках (замках, касцёлах, цэрквах) увасобіліся новыя архітэктурныя стылі?
3. Якія жанры літаратуры былі пашыраны на тэрыторыі Беларусі ў Познім сярэднявеччы?
4. Якія народныя святы беларусы захавалі да нашых дзён? Як вы лічыце, наколькі важна захоўваць гэтую культурную спадчыну?
5. Намалюйце постар або стварыце інфаграфіку на тэму «Культура Беларусі ў другой палове XIII — XV ст.».